**Мемарандум**
**аб супрацоўніцтве беларускіх моладзевых НДА**
**у межах Беларускага нацыянальнага моладзевага савета “РАДА”**

Мы, беларускія моладзевыя НДА, з’яўляючыся актыўнымі і адказнымі прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці і аб’яднаныя ў Беларускі нацыянальны моладзевы савет “РАДА”, дадзеным Мемарандумам зацвярджваем рамкі і прыярытэты нашай дзейнасці з мэтай кансалідацыі моладзевых арганізацый і далейшага ўзмацнення голасу беларускай моладзі на нацыянальным і міжнародным узроўнях.

Усведамляючы прыналежнасць да еўрапейскай сям’і, мы падзяляем наступныя каштоўнасці:

- Дэмакратыя;
- Правы Чалавека;
- Плюралізм;
- Роўнасць;
- Недыскрымінацыя;
- Нацыянальная самасвядомасць;
- Устойлівае развіццё.

Беларускі нацыянальны моладзевы савет “РАДА” ў сваёй дзейнасці кіруецца прынцыпам роўнага прадастаўлення магчымасцей усім сяброўскім арганізацыям, дзе кожная з іх мае роўны па важнасці голас. “РАДА” зацікаўленая ў шырокай разнастайнасці сяброўскіх арганізацый, дзеля таго, каб эфектыўна прадстаўляць інтарэсы розных сацыяльных груп на нацыянальным і міжнародным узроўнях. Вынікам такога шырокага прадстаўлення павінна стаць дасягненне ўстойлівых вынікаў для ўсёй беларускай моладзі ў цэлым.

Сярод усяго спектру **правоў і інтарэсаў моладзі БНМС «РАДА»** вылучае ў цэнтр сваёй ўвагі наступныя накірункі:

I. адным з фундаментальных правоў маладых грамадзян з’ўляецца права на ўдзел у распрацоўцы і рэалізацыі дзяржаўнай моладзевай палітыкі, бо дадзенае права – гарантыя адпаведнасці дзяржаўнай моладзевай палітыкі пажаданням маладых грамадзян, і фактар, які спрыяе павышэнню зацікаўленасці моладзі да грамадскага жыцця і жыцця краіны ў цэлым;

II. забеспячэнне для маладых грамадзян магчымасцяў абароны ад прыніжэння свайго гонару і годнасці і ад незаконнага ўціску на іх па асабістых, палітычных, рэлігійных і іншых матывах з боку адміністрацый і персаналу вучэбна-выхаваўчых установаў і іншых грамадзян, а таксама барацьба з усімі формамі дыскрымінацыі;

III. рэфармаванне сістэмы адукацыі згодна з актуальнымі выклікамі ў бок большай гнуткасці, дзе змест і структура адукацыі павінны развівацца ў адпаведнасці з патрэбамі міжнароднага і нацыянальнага рынку працы; сістэма адукацыі павінна стварыць умовы для свабоднага і ўсебаковага развіцця асобы навучэнца ў межах юрыдычных і маральных норм;

IV. спрыянне ў рэалізацыі маладымі людзьмі канстытуцыйнага права на працу, прасоўваючы адначасова ідэі ўласнай актыўнасці і прывучаючы такім чынам моладзь не чакаць пасіўна дапамогі ад дзяржавы, а праяўляць актыўнасць і самім клапаціцца аб павелічэнні ўласнага дабрабыту; у сферы сацыяльнай абароны прынцыпова важным з'яўляецца, каб маладыя людзі з фізічнымі абмежаваннямі не заставаліся па-за ўдзелам у грамадска-палітычным і сацыяльна-эканамічным жыцці краіны;

V. вырашэнне комплексу праблем, звязаных са службай моладзі ва Узброеных Сілах, псіхічнага і фізічнага здароўя маладых людзей, прафілактыкай ВІЧ і захворванняў, якія перадаюцца палавым шляхам, алкагалізму, наркаманіі і іншых з'яў, якія разбуральна ўплываюць на здароўе моладзі;

VI. правядзенне беларусізацыі і ўключэнне інтарэсаў беларускай моладзі ў дыялог народаў і культур у сферы міжнародных дачыненняў, як праз удзел у міжнародных праектах нацсавета, так і ў прыватным выпадку.

Заклікаем усе моладзевыя арганізацыі і ініцыятывы грамадзянскай супольнасці незалежна ад формы рэгістрацыі, якія дзейнічаюць у Беларусі і падзяляюць прынцыпы і каштоўнасці Мемарандума, далучацца да дзейнасці Беларускага нацыянальнага моладзевага савета “РАДА”.